# Голас душы

Яднанне ў любові

№ 10 (525)
Серада, 31 кастрычніка 2015 г.

Штотыднёвы хрысціянскі бюлетэнь


## 1–8 ЛІСТАПАДА – ДНІ АСАБЛІВАЙ ДАПАМОГІ ЧЫСЦОВЫМ ДУШАМ

*З 1 па 8 лістапада Касцёл асабліва моліцца за памерлых. У гэты час вернікі маюць магчымасць атрымаць поўны адпуст, наведаўшы магілкі.*



*Да ўмоў адпусту належыць:*

– адсутнасць усялякай прывязанасці да граху, нават штодзённага;

– стан асвячальнай ласкі (адсутнасць неадпушчанага цяжкага граху);

– прыняцце Святой Камуніі;

– малітва ў інтэнцыях Святога Айца («Ойча наш...», «Вітай, Марыя...», «Веру ў Бога...»).

Гаворка не ідзе пра малітву за самога Святога Айца, хоць і такая малітва вельмі каштоўная; малітва, звязаная з адпустам, павінна быць у інтэнцыі тых спраў, за якія штодзень моліцца Папа;

– наведванне могілак.

На працягу першых васьмі дзён лістапада вернікі чарговы раз будуць мець выключную магчымасць дапамагчы душам, якія церпяць у чысцы. Гэтыя дні – час асаблівай малітвы, каб памерлыя мелі ўдзел у Хрыстовай перамозе над смерцю.

Гэта датычыць асабліва тых, каму пасля смерці неабходна ачы-шчэнне, чысцец, які з'яўляецца «пярэднім пакоем да неба». У перыяд малітваў за памерлых можна атрымаць адпусты за іх.

У сам дзень 2 лістапада – пры захаванні тых жа ўмоваў – таксама можна атрымаць адпуст за памерлых, звязаны з наведваннем касцёла або капліцы.

*Варта памятаць, што малітва і ахвяраванне адпусту за памерлых нашмат важнейшае за ўсялякія знешнія праявы памяці.*

Дагмат аб існаванні чысца Касцёл абвясціў на Саборы ў Ліёне ў 1274 г., а пацвердзіў і ўдакладніў на Трыдэнцкім Саборы (1545-1563) у асобным дэкрэце. Гэты дагмат засноўваецца на тым, пра што ўзгадваецца ў Святым Пісанні, і на касцёльнай традыцыі, якая сягае II ст. Вялікі ўклад у развіццё вучэння аб чысцы ўнёс святы Аўгусцін.

Дагмат падкрэслівае дзве праўды: існаванне чысца як пасмяротнага пакарання за грахі, а таксама магчымасць і патрэбу малітвы і ахвяравання ў інтэнцыі чысцовых душаў.

*Па матэрыялах Catholic.by.*
*Фота з www.commons.wikimedia.org*

# ПАНТЫФІК КАНАНІЗАВАЎ БАЦЬКОЎ СВ. ТЭРЭЗЫ АД ДЗІЦЯТКА ІСУСА

*18 кастрычніка Папа Францішак кананізаваў Луі і Зэлі Мартэн, бацькоў адной з самых вядомых каталіцкіх святых Тэрэзы ад Дзіцятка Ісуса. Да хвалы алтара былі ўзнесены таксама італьянскі святар Вінчэнца Гросі і іспанская законніца Марыя ад Беззаганага Зачацця.*

У гаміліі падчас кананізацыйнай Імшы на плошчы Святога Пятра Папа заўважыў, што біблійныя тэксты, якія прагучалі падчас літургіі слова, «указваюць на тэму служэння і клічуць ісці за Ісусам па шляху пакоры і крыжа». Прарок Ісая апісваў слугу Божага як асобу, якая не можа пахваліцца знакамітай генеалогіяй, якой пагарджалі, ад якой адракаліся ўсе, якая мела вялікі досвед пакутаў, нагадаў Пантыфік. Слуга Пана не быў асобай, якой прыпісваліся вялікія справы і ўрачыстыя прамовы, але той, якая выконвала задуму Бога праз пакору, маўчанне і ўласнае цярпенне, дадаў Папа.

«Яго місія выконваецца праз цярпенне, якое дазваляе Яму зразумець церпячых, несці цяжар правінаў іншых людзей і адкупіць іх. Маргіна-лізацыя і цярпенне Слугі Госпада, якія трывалі аж да самой смерці, сталі плённымі да такой ступені, што адкупілі і збавілі мноства людзей», – сказаў Святы Айцец.

Пантыфік падкрэсліў, што такім Слугой Божым з'яўляецца Ісус Хрыстос, Які заклікае наследаваць Яго на шляху любові і служэння, адкідаючы спакусы заняцця першых месцаў і кіравання іншымі, як прапануе свет. Па словах Папы, перад людзьмі, якія намагаюцца дасягнуць улады і поспеху, вучні пакліканы рабіць адваротнае, а служэнне павінна быць стылем кіравання ў хрысціянскай супольнасці.

«Хто служыць іншым і па-сапраўднаму не карыстаецца прэстыжам, той ажыццяўляе ў Касцеле сапраўдную ўладу. Ісус заклікае нас да змены нашай ментальнасці і пераходу ад прагі ўлады да радасці незаўважнасці і служэння; да выкаранення інстынкту панавання над іншымі і рэалізацыі цноты пакоры», – адзначыў Папа.

Пантыфік заўважыў, што ідэалам для на-след-вання з'яўляецца асоба Ісуса Хрыста. «У біблій-най традыцыі Сын Чалавечы з'яўляецца тым, хто атрымаў ад Бога "панаванне, хвалу і каралеў-скую ўладу". Ісус напоўніў гэты вобраз новым сэнсам і патлумачыў, што Ён мае панаванне – як слуга, хвалу – як здольны прынізіцца, каралеўскую ўладу – як гатовы да поўнага ахвяравання ўласнага жыцця. І сапраўды, праз свае пакуты і смерць, з дапамогай якіх Ён заняў апошняе месца, Ён дасягнуў найбольшай велічы ў служэнні і ўчыніў з яе дар для свайго Касцёла», – сказаў Папа.

Па словах Пантыфіка, існуе несумяшчаль-насць паміж разуменнем улады згодна з крытэрыямі гэтага веку і пакорным служэннем, якое павінна характарызаваць уладу, згодна з навучаннем і прыкладам Ісуса.

«Несумяшчальнымі з'яўляюцца амбіцыі, кар'ерызм і наследаванне Хрыста; несумяшчальныя ўзнагароды, поспех, слава, зямныя трыумфы і логіка ўкрыжаванага Хрыста.

Сумяшчальнымі, аднак, з'яўляюцца Ісус – "да-сведчаны ў пакутах" – і нашы пакуты», – пад--крэсліў Святы Айцец.

Папа адзначыў, што Ісус, глыбока ведаючы праблемы чалавека, здзяйсняе сапраўднае святарства міласэрнасці і спачування.

«Ён непасрэдна перажыў досвед чалавечых цяжкасцяў і ведае знутры сітуацыю чалавека. Тое, што Ён не меў граху, не перашкаджае Яму разумець грэшнікаў.

Яго хвала – гэта не хвала амбіцый і прагі панавання, але хвала любові да людзей, прыняцця і раздзялення іх слабасцяў, адарэння іх аздараўляючай ласкай, суправаджэнне з бясконцай чуласцю на іх турботным шляху», – звярнуў увагу Пантыфік.

Па словах Папы, кожны ахрышчаны пакліканы ўдзельнічаць у святарстве Хрыста. Для гэтага ўсе могуць атрымаць любоў, якая выплывае з адкрытага сэрца Ісуса, і станавіцца «каналамі» Яго любові, спачування, асабліва да тых, хто перажывае пакуты, трывогу, роспач ці адзіноту.

Папа паставіў у прыклад кананізаваных падчас гэтай Эўхарыстыі святых, якія пакорна служылі братам, наследуючы Боскага Настаўніка.

«Святы Вінчэнца Гросі быў дбайным проба-шчам, заўсёды ўважлівым да патрэбаў сваіх парафіян, асабліва да ўразлівасці моладзі. Ён для ўсіх клапатліва ламаў хлеб Слова і стаў Міласэрным Самаранінам для найбольш патрабуючых. Святая Марыя ад Беззаганага Зачацця з вялікай пакорай жыла служэннем апошнім, атуляючы асаблівым клопатам бедных дзяцей і хворых лю-дзей.

Святыя сужэнцы Луі Мартэн і Мары-Зэлі Герэн сведчылі аб хрысціянскім служэнні ў хрысціянскай сям'і, будуючы дзень за днём асяроддзе, поўнае веры і любові. У той атмасферы нарадзі-лі-ся пакліканні іх дачок, у тым ліку св. Тэрэзы ад Дзіцятка Ісуса», – сказаў Папа.

На заканчэнне гаміліі Пантыфік заклікаў вер-нікаў натхняцца сведчаннем новых святых на шляху раднаснага служэння братам, давяраючы Божай дапамозе і мацярынскай апецы Марыі.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё.*

# «СЕМІНАРЫЯ – ШАНЕЦ ДЛЯ СМЕЛЫХ». РАЗМОВА З НОВЫМ РЭКТАРАМ ДУХОЎНАЙ СЕМІНАРЫІ Ў ПІНСКУ

*5 кастрычніка ўрачыста пачынаецца навучальны год у Міждыяцэзіяльнай вышэйшай духоўнай семінарыі ў Пінску. З гэтай нагоды Catholic.by публікуе інтэрв'ю з кіраўніком установы — прызначаным у жніўні на пасаду рэктара кс. Андрэем Рылкам.*



– *Ксёндз Андрэй, распавядзіце крыху пра сябе.*

– Я паходжу са шчаслівай шматдзетнай сям'і. Тата быў звычайным рабочым. Маці большасць свайго жыцця прысвяціла выхаванню дзяцей.

У канфесійным плане сярод маіх продкаў ёсць і каталікі, і праваслаўныя. Так што належу да тыповай беларускай сям'і, дзе з увагі на радню адзначаюцца дзве Пасхі і двое Калядаў.

Мне 36 год. Нарадзіўся і жыву на Палессі. Мая родная вёска Люсіна знаходзіцца на памежжы гістарычнай Случчыны і Піншчыны (цяперашні Ганцавіцкі раён). Вёска цесна звязана з лёсам класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Тут ён працаваў маладым настаўнікам, тут сустрэў сваё першае каханне – Ядвісю, тут пачаў пісаць свае першыя сур'ёзныя творы. І менавіта гэтым мясцінам прысвяціў першы том аднаго з асноўных твораў свайго жыцця – трылогіі «На ростанях». Першая частка трылогіі «У палескай глушы» – гэта фактычна біяграфічны аповед пра яго жыццё на маёй маленькай радзіме.

– *Як Вы прыйшлі да веры і вырашылі стаць святаром?*

– На пачатку 1990-х, калі пасля ліхалеццяў камунізму нашае грамадства перажывала вялікі рэлігійны ўздым, таксама і наша сям'я больш актыўна пачала наведваць касцёл. У тыя часы многія бацькі прыходзілі да веры праз дзяцей. Так было і ў нашай сям'і. Спачатку мы, дзеці, актыўна ўключыліся ў жыццё парафіі, а пасля за намі пайшлі і бацькі.

Памятаю, як у 1993 г. да нас прыехаў першы паслясавецкі пробашч. Усіх захапляла яго вера, культура, эрудыцыя, бязмежная ахвярнасць і пашана да кожнага чалавека. З цягам часу ён пачаў ладзіць у нас дома катэхетычныя заняткі для мясцовых католікаў і ўсіх жадаючых пазнаць глыбей хрысціянства.

Гэтыя сустрэчы са святаром былі для мяне, крытычнага да аўтарытэтаў падлетка, сапраўдным адкрыццём. Пасля ягоных катэхез я «перапалапачваў» усю, якую толькі мог знайсці, літаратуру, каб «абвергнуць» для сябе яго каталіцкія тэзісы ў абарону веры, падлавіць на памылцы.

Але кожны раз пераконваўся, што ксёндз меў рацыю, што яго вера разумная, лагічная, беспамылковая.

Думаю, што ў гэтым пошуку праўды нарадзілася жаданне адкрыць сапраўдную веру і сапраўднага Бога, а пасля – прага дзяліцца адкрытым з іншымі. Спачатку я марыў стаць свецкім місіянерам-прапаведнікам. Потым у сэрцы перамагаў унутраны голас, які клікаў на шлях святарства. Я разумеў, што на гэтым шляху змагу не толькі абвяшчаць адкрытую Праўду, якая захапляла да глыбіні душы, але змагу і дапамагаць людзям канкрэтнымі дзеяннямі: вырываць іх з путаў хлусні і бессэнсоўнасці жыцця, яднаць з Богам не толькі праз слова, але і праз сакрамэнты. А святарства – гэта магутнейшы інструмент выратавання чалавека.

– *Якую маеце духоўную і свецкую адукацыю? У якой семінарыі вучыліся? Дзе служылі як святар?*

– Пасля заканчэння сярэдняй школы я паступіў у адзіную тады ў Беларусі Вышэйшую духоўную семінарыю ў Гродне. Пасля заканчэння семінарыі ў 2003 г. абараніў магістарскую дысертацыю па тэалогіі ў Люблінскім каталіцкім універсітэце. Прыняў прэзбітэрскае пасвячэнне. Два гады служыў як душпастыр у парафіях Пінскай дыяцэзіі. Пасля па рэкамендацыі кардынала Казіміра Свёнтка вярнуўся ў Люблінскі ўніверсітэт, але ўжо на факультэт філасофіі, дзе спачатку скончыў магістратуру.

*Аляксандр Гелагаеў*

*Фота з www.vk.com. Працяг будзе.*

# «ПРАЦУЮЧЫ Ў “КАРЫТАС”, МАЕШ ДАДАТКОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ПРЫНОСІЦЬ КАРЫСЦЬ»

*1 кастрычніка прызначаны новы дырэктар Рэлігійнай місіі «Дабрачыннае каталіцкае таварыства “Карытас”» Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, якім стаў брат Андрэй Жылевіч OFMCap. Прапануем інтэрв’ю з новапрызначаным дырэктарам.*

– *Паважаны брат Андрэй, вітаем Вас на пасадзе дырэктара Рэлігійнай місіі «Дабрачыннае каталіцкае таварыства “Карытас”» Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі. Раскажыце, калі ласка, крыху пра сябе.*

– Я нарадзіўся на Гродзеншчыне ў в. Камянчане Іўеўскага раёна. Вучыўся ў Ліпнішкаўскай сярэдняй школе. Адначасова быў міністрантам у парафіі ў Ліпнішках, дзе працавалі браты капуцы- ны. Там пачаў прыглядацца да жыцця братоў. Пасля заканчэння школы ў 1996 годзе напісаў просьбу да правінцыяла Варшаўскай правінцыі аб прыняцці ў Ордэн Меншых Братоў Капуцынаў і быў прыняты. Ад верасня 1996 года распачаў навіцыят у Ордэне ў Польшчы, а ў 2002 склаў вечныя манаскія абяцанні.



Вышэйшую адукацыю атрымаў у Каталіцкім ўніверсітэце Любліна, які скончыў у 2004 годзе. 22 мая 2004 года прыняў прэзбітэрскае пасвячэнне ў Маладзечне. Быў накіраваны працаваць у Докшыцы. Там быў магістрам пастулантаў, пасля настаяцелем кляштара. У 2009 годзе быў абраны віцэправінцыяльным міністрам Беларускай Віцэправінцыі Меншых Братоў Капуцынаў. У 2013 годзе віцэправінцыя стала называцца кустодыяй. Каля трох гадоў таму была створана супольнасць у Мінску, дзе я жыву і працую зараз. На дадзены момант супольнасць складаецца з трох братоў. Тут, у Мінску, мы будуем не толькі духоўны касцёл, але і матэрыяльны – будынак касцёла і кляштар каля вёскі Копішча.

– *Раскажыце, калі ласка, як Вы ўспрынялі прапанову ўзначаліць «Карытас» Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі.*

– Прапанова ўзначаліць «Карытас» была для мяне неспадзяванай. Дарэчы, сваю згоду я выказаў у Будславе перад абразом Маці Божай. Я сказаў, што хачу служыць Касцёлу, калі такая воля майго настаяцеля і біскуп лічыць мяне годным гэтага.

– *Што стала асноўным матывам для згоды?*

– Першае, што я падумаў, – гэта тое, што адным з прыярытэтаў нашага Ордэна, яго харызмай з’яўляецца паслуга ўбогім і патрабуючым. Гэта вынікае з нашай францішканскай духоўнасці. Мне падалося, што «Карытас» – гэта той самы дух, нешта падобнае. І гэта мне якімсьці чынам блізка. Працуючы ў «Карытас», можна рэалізаваць сваё манаскае пакліканне слядамі святога Францішка Асізскага.

– *На Вашую думку, якія выклікі Вас чакаюць? Што падаецца Вам цікавым у будучай працы?*

– Я падыходжу да гэтай працы з аптымізмам, таму што я люблю людзей. Я не баюся выклікаў, бо маю пэўны досвед працы з людзьмі, а таксама кіравання супольнасцю. Можа, гэта не дакладна тое самае, але мне гэта цікава. Я, хіба як кожны чалавек, маю патрэбу быць карысным. Мне здаецца, што гэта адна з першапачатковых патрэбаў хрысціяніна – быць карысным для Касцёла, для грамадства, для краіны, для людзей патрабуючых. Усё гэта прыносіць таксама задавальненне і радасць. Думаю, што, працуючы ў «Карытас», маеш дадатковыя магчымасці прыносіць карысць. «Карытас» – прылада, якая існуе ў Касцёле і для Касцёла, выкарыстоўваючы гэта, мож- на рабіць больш дабра.

– *Якая асноўная мэта дзейнасці «Карытас»?*

– Мне здаецца, што, паколькі сама назва «Карытас» азначае «любоў», то і асноўная мэта арганізацыі – несці любоў, дзяліцца любоўю. І рабіць гэта не толькі тэарэтычна, словам, але і матэрыяльна.

– *Як Вы бачыце сваю працу ў арганізацыі?*

– Кожная праца ў Касцёле з’яўляецца службай. Я ў першую чаргу не лічу сябе якімсьці там ганаровым кіраўніком і перакананы нават, што такім не буду. Я пакліканы да таго, каб служыць, дапамагаць. Менавіта гэта збіраюся рабіць таксама ў «Карытас». Мне здаецца, што перш за ўсё трэба, каб калектыў, у якім мне давядзецца працаваць, быў адной сям’ёй. Важна, каб людзі, якія працуюць у «Карытас», сапраўды ўмелі рабіць гэта з адданасцю, з павагай адзін да аднаго. Бо толькі тады, калі будзе такая сямейная атмасфера на месцы працы, якую мы здзяйсняем таксама для іншага чалавека, толькі тады можна будзе гаварыць пра эфектыўнасць, пра дапамогу іншым людзям. Я хачу старацца зрабіць усё, што магу, дзеля таго, каб «Карытас» развіваўся, каб ён быў Божай прыладай для дапамогі патрабуючым.

– *Як бы Вы маглі сфармуляваць дэвіз Вашай працы ў «Карытас»?*

– Дэвізам маёй працы я абраў бы словы апякункі сённяшняга дня, св. Тэрэзы ад Дзіцятка Езус: «быць любоўю ў сэрцы Касцёла, маёй Маці». Думаю, што гэта добрыя словы.

*Паводле www.caritas-minsk.by*

# ХРАНИМА БОГОМ БУДЬ, РОДНАЯ БЕЛАРУСЬ

Благодарю Тебя, Господь, за Беларусь,
За наше житие земное,
Красоты края нам дарованы Тобою,
Премудрости Творца всегда дивлюсь.



Хранима Богом будь, родная Беларусь,
Для сердца нашего здесь всё родное,
И небо мирное над нашей головою,
Спаси и сохрани нас! – Господу молюсь.

Где есть любовь, не будет жизнь порожней.
Пусть крепнет и надеждой наш народ,
Стараясь жить по воле только Божьей,
Любовь и вера к вечности ведёт.

# ЗЕМНУЮ ЖИЗНЬ НА ВРЕМЯ БОГ ДАЁТ



Над чистотою сердца положено трудиться,
Пусть это христианин здесь, на земле, поймёт.
Ведь если человек по воле Господа живёт,
Его душа на небесах искрится.

Для каждого из нас придёт черёд когда-то,
Душа свой совершит с земли полёт.
Дай Бог, за жизнь достойный дать отчёт,
Неверных ждёт лишь горькая расплата.

Звон колокольный в храмы нас зовёт,
Святые Таинства священник совершает.
Чрез покаянье груз с души спадает,
Благодаря Христа, душа поёт.

Свят, Свят, Свят Бог! – поём мы все, любя,
И полнится надеждою земля...
О, человек! Не проходи же храмы стороной,
Там помощь для души – там сохранит Господь тебя, родной!

И в жизни этой помнить надо свято:
Наступит час – Господь всех в вечность призовёт.
За верность Богу каждый радость обретёт,
А за грехи ждёт неминуемо расплата.

*Людмила Прохатская.Фото с www.ostrovets.by и www.woman.ru*

# ЧЫРВОНАЯ НІТКА НА ЗАПЯСЦІ – «І БОГУ СВЕЧКА, І Д'ЯБЛУ АГАРАК»

*Усё пачалося з таго, што я ўбачыла ў сваёй знаёмай чырвоную нітку на левым запясці рукі. Стала распытваць, для чаго такі незвычайны аксесуар. Аднак адказу так і не атрымала.*

Тут я пачала прапаноўваць свае варыянты, маўляў, для таго, каб не выраклі, або прываражыць хлопца, на што дзяўчына адказвала строгім адмаўленнем. Мяне гэтая тэма зацікавіла і прымусіла шукаць адказ на сваё ж пытанне.

Знаёмая лічыць сябе атэісткай, хоць і ахрышчана ў праваслаўі, надае асаблівы сэнс талісманам. Аднак ёсць шмат выпадкаў, калі хрысціяне таксама носяць такія ніткі на руцэ. Што значыць гэты сімвал і якое дачыненне ён мае да хрысціянства? З гэтым усім я і паспрабавала разабрацца.

### Чырвоная нітка і акультызм

Нашэнне чырвонай ніткі, як аказалася, мае найперш акульт-ны характар. На працягу стагоддзяў людзі ўкладалі ў гэты сім-вал розны сэнс.

Яшчэ са старажытнасці чырвоная нітка лічылася своеасаблівым абярэгам ад чараў і сурокаў. Знешнімі праявамі суроку ў народзе прынята лічыць раптоўную слабасць і галаўны боль. У перспектыве сурок можа стаць прычынай працяглых праблем са здароўем, няўдач у асабістым жыцці і кар'еры.

У многіх рэлігіях чырвоную нітку носяць, каб пазбавіцца ад злосці ўнутры самога сябе.

Прадстаўнікі іўдзейскай кабалістычнай секты (Кабала), напрыклад, надаюць гэтаму сімвалу асаблівы сэнс. Чырвоная нітка, завязаная блізкім чалавекам або каханым, па іх меркаванні, з'яўляецца моцным абярэгам ад сурокаў і зайздрасці іншых людзей.

Дарэчы, да кабалістаў сябе адносяць некаторыя зоркі шоў-бізнесу.

Кабалісты павязваюць чырвоную нітку менавіта на левае запясце, бо вераць, што негатыўная энергія ўваходзіць у цела чалавека з левага боку, а нітка з'яўляецца своеасаблівым «шчытом» для чалавека, які яе носіць. Паводле вучэння, самай вялікай абарончай энергіяй валодаюць ніткі, прывезеныя з Ерузалема.

У славян і некаторых усходніх народаў ёсць павер'е, што чырвоную нітку людзі носяць на руцэ для таго, каб прыцягнуць у сваё жыццё ўдачу і дастатак.

Гэта толькі самыя асноўныя версіі, для чаго носіцца чырвоная нітка. На самой жа справе іх даволі шмат. Адзінае, што іх аб'ядноўвае, – гэта вера ў нейкую магічную, звышнатуральную сілу гэтага прадмета.

### Чырвоная нітка і хрысціянства

Пра значэнне чырвонай ніткі для хрысціян я паразмаўляла са *святаром-харызматыкам Яўгенам Эйсмантам SAC*.

– Ксёндз Яўген, як вядома, чырвоную нітку носяць не толькі атэісты і прадстаўнікі акультычных вучэнняў, але і хрысціяне--католікі. Як Касцёл ставіцца да нашэння такога сімвала?

– Езус кажа: «Бяда вам, калі чыніце нешта, што не з'яўляецца Божым і выконваеце толькі свае наказы, якія ні да чаго не даводзяць» – так можна перафразаваць словы Евангелля, якія Езус кажа да кніжнікаў і фарысеяў, што ў святыні робяць адно, а другое – выйшаўшы з яе. Гэта таксама тычыцца тых людзей, якія кленчаць у першых лаўках і моляцца, звязаныя з Касцёлам вельмі моцна, а выходзячы са святыні, карыстаюцца паслугамі бабулек-шаптух, займаюцца магіяй і чарамі. У касцеле кажуць, што іх збаўленнем з'яўляецца крыж, Езус, а выйшаўшы з яго, чапляюць чырвоную нітку, якая, паводле іх веры, дапамагае ад сурокаў і чараў. Калі мы давяраем сваё жыццё Езусу Хрысту, то тым самым кажам, што Ён з'яўляецца нашым Панам і Збаўцам. Толькі Яго хочам слухаць і для Яго хочам жыць, хочам, каб Ён быў нашай абаронай. Калі ж, выходзячы з касцёла, вяжам такую чырвоную нітку, то тым самым кажам Богу, што нашыя словы хлусня, а праўда тое, што так робяць усе і мы ў гэта верым.

– Якую небяспеку можа несці гэты сімвал?

– Калі мы выкарыстоўваем магію, ходзім да бабуль-шаптух, вяжам нешта на свае рукі і цела, мы гэтым самым адкрываем форткі для злога духа. Ён потым праз гэтую рэч уваходзіць у цела чалавека і знявольвае яго. Павязваючы свайму бліжняму гэтую нітку, мы можам таксама і яго адкрыць на ўплыў злога.

Бывала, падчас заступніцкіх малітваў я не мог зразумець, што знявольвае чалавека. І часта прычынай з'яўляўся зварот да магаў, вера ў забабоны або нашэнне розных сімвалаў, у тым ліку і чырвонай ніткі.

– А калі чалавек у гэты сімвал не ўкладвае ніякага сэнсу, а проста носіць для прыгажосці? Ці дзейнічае ён у гэтым выпадку?

– Трэба заўсёды задаваць сабе пытанне «навошта?» Навошта завязваць, навошта гуляць у гульні з сатаной? Гэта свайго роду дражненне. Я не маю інтэнцыі, але павяжу. А што злое можа стацца? Я так, для моды нашу. Гэта нібы з сабакам. Ён цябе не пакусае, пакуль ты блі-жэй не падыйдзеш. Спачатку ты вешаеш нітку, якая «нічога не значыць», потым яшчэ што-сьці... Потым пачынаюцца нараканні, што Бог цябе не асцярог.

Замест пасляслоўя

Для мяне так і засталося загадкай, чаму мая знаёмая носіць чырвоную нітку. Бог кожнаму з нас даў свабодную волю, таму мы можам рабіць выбар у любой сітуацыі. І калі я лічу сябе са-праўдным хрысціянінам або хрысціянкай, тады навошта мне ставіць «і Богу свечку, і д'яблу агарак»?

*Марына Валасар. Catholic.by*

# ROZWAŻANIE NA TEMAT KAPŁAŃSTWA

Niesamowicie trafne określenie kapłaństwa daje Jan Paweł II. Jest ono z jednej strony najbardziej proste, zrozumiałe dla każdego człowieka i w każdym czasie. Z drugiej strony wnika i wydobywa najgłębszą istotę kapłaństwa. Dar i tajemnica. W tej definicji jest obecny zarazem Bóg i człowiek, który doświadcza na sobie i w sobie boże działanie. Bóg jest Tym, który zarazem obdarza powołaniem i Tym, który jedynie wie, dlaczego konkretny byt ludzki zostaje nim obdarzony. Człowiek natomiast przyjmuje dar kapłaństwa, który rodzi w nim niepokój i wielość pytań, na które sam o własnych siłach nie jest w stanie odpowiedzieć – staje wobec tajemnicy. Tylko Bóg powołujący może kapłanowi odpowiedzieć, dlaczego właśnie on, a nie, kto inny, został wezwany do bycia uczniem i świadkiem bożych tajemnic.



Świadomość własnej grzeszności i wielu słabości, ograniczeń intelektualnych i fizycznych rodzi pytanie: dlaczego ja? Po ludzku patrząc nie nadaje się być kapłanem, nie jestem godzien nazywać się Alter Christus. Jednak moje spojrzenie w głąb siebie jest niezmiernie mniejsze i mniej przenikliwe niż spojrzenie Boga. To jeszcze raz dowodzi, że w Bóg widzi całe dobro we mnie. Jego spojrzenie jest bardziej miłosierne niż mój pretensjonalny stosunek do siebie i swoich zachowań. On przebacza mi szybciej niż ja sam mogę to uczynić.

Kim jest jednak kapłan i czym jest kapłaństwo? Kapłan jest to człowiek, który umiera, wtedy, gdy zaczyna żyć i zaczyna żyć dopiero wtedy, gdy już umiera. Kapłan i kapłaństwo jest nastawione na obumieranie. Trafnie oddaje to wypowiedź św. Pawła: „Dla mnie żyć to Chrystus, a śmierć jest mi zyskiem". Sam Chrystus wyznacza sposób przeżywania kapłaństwa: „Kto chce zachować swoje życie straci je, a kto straci swe życie z mego powodu, ten je zachowa". Bez ofiary z życia nie będzie kapłaństwa określającego człowieka, lecz zostanie wyłącznie utożsamione z zawodem, ze sposobem zdobycia środków na swoje utrzymanie.

Kapłan stoi najbliżej tajemnicy Boga. W szczególny sposób stoi przed tajemnicą Eucharystii. Na słowa kapłana to jest ciało moje... to jest krew moja, pod działaniem Ducha Świętego, Chrystusowa ofiara dla zbawienia świata, wchodzi w rzeczywistość ludzkiej egzystencji. Jest on tym, który sprowadza Chrystusa dla ludzi, jak też sam staje się podmiotem, na który oddziaływuje Jego zbawcza ofiara. Kapłan i jego kapłaństwo powinno rodzić się i wzorować się na Eucharystii, na ofiarowaniu. Tylko ten, kto ofiaruje siebie, swoje życie dla Chrystusa może zrozumieć Jego ofiarę. Ofiarując siebie, kapłan, może stawać się autentycznym głosicielem ofiary Jezusa. Wartość, którą nosi w sobie żertwa z życia, pozwala odkryć wartość poświęcenia się Boga dla człowieka.

Złożony przez Chrystusa dar ze swego życia dla ludzkości otwiera przed kapłanem potrzebę ofiary nie tylko dla Boga, ale i dla człowieka. Jak Chrystus był ustanowiony arcykapłanem dla człowieka, podobnie kapłan jest ustanowiony dla ludzi. Określenie „ja kapłan" powinno zawierać w sobie również prawdę „ja kapłan dla ciebie". Kapłaństwo do tego stopnia powinno być dla człowieka i jego zbawienia, ażeby w człowieku mógł dostrzec Chrystusa. Aby moje poświęcenie dla Niego było w podobny sposób poświęceniem dla człowieka. Sposób życia wyznaczony przez Chrystusa: „Kto zachowa swoje życie straci je, a kto straci swe życie z mego powodu, ten je zachowa", przybiera również inną postać: „Kto straci swe życie dla zbawienia ciebie, rodzaju ludzkiego, znajdzie je".

Kapłan, który umiera, gdy zaczyna żyć, tzn. ten, który u początku powołania kapłańskiego spala swe życie, ofiaruje je dla Boga i człowieka i zaczyna żyć, gdy już umiera, czyli ten, który przez ofiarowanie swojego życia, u jego kresu dostrzega otwarte bramy raju, ramiona Chrystusa, który wypełnia swą obietnicę. Zamiast śmierci daje mu nowe, wieczne życie.

*Ks. Karol Baranowski*

# ТАЯМНІЦА ЖАНОЦКАСЦІ І МУЖНАСЦІ

*Калі Бог стварыў нас, то ў гэтым была нейкая мэта. Ён стварыў нас у рознасці, але ў адзінай годнасці асобаў. У чым сутнасць рознасці стварэння жанчыны і мужчыны Усемагутным Богам? Давайце паразважаем менавіта пра сутнасць гэтай рознасці і паглядзім на яе зусім з іншага боку.*

Мы можам з першага позірку адрозніць мужчыну ад жанчыны, хоць, улічваючы сённяшнія метамарфозы моды, можна сказаць, амаль заўсёды. Адрозніваюцца яны цялесна. Як гаварыў вялікі Папа Ян Павел II, гэта два спосабы быцця целам, вельмі розныя, але з выразным прызначэннем. Мужчына адораны Богам так, каб мог быць бацькам. Жанчына адорана так, каб магла быць маці. І менавіта ў гэтым уся таямніца рознасці, і дзеля гэтага нас стварыў Добры Бог двума рознымі спосабамі. Мужчына і жанчына, створаныя для еднасці ў сужэнстве, павінны прыносіць плады бацькоўства.



Мы створаны для айцоўства і мацярынства, нягледзячы на шляхі нашага жыццёвага пакліканння. Мацярынства і бацькоўства ўпісаны ў нашыя сэрцы Богам. Ці будзе, напрыклад, добра несці сваё служэнне святар, які забыўся пра тое, што павінен быць духоўным бацькам для сваіх вернікаў? І ці самотная жанчына, якая адорвае сваім сэрцам шмат сіротаў, не з'яўляецца сапраўднай маці?

Сучасным прыкладам рэалізацыі духоўнага мацярынства з'яўляецца, безумоўна, Маці Тэрэза з Калькуты, якая прыгарнула самых абяздоленых дзяцей свету. Яскравым прыкладам духоўнага бацькоўства з'яўляецца Папа Ян Павел II. Ён нястомна на працягу ўсяго свайго жыцця клапаціўся пра кожнае чалавечае жыццё і няспынна нагадваў пра вартасць і пашану жыцця кожнай чалавечай істоты з моманту зачацця і да натуральнай смерці.

Выключнае пакліканне да служэння Богу па-трабуе адмовы ад стварэння ўласнай сям'і, адмовы ад свайго фізічнага бацькоўства ці мацярынства, каб быць у большай ступені духоўнымі айцом ці маці.

Калі Бог стварыў нас як мужчыну і жанчыну, паклікаў да бацькоўства і мацярынства, то Ён адарыў нас усімі патрэбнымі якасцямі для выканання розных роляў. Жанчына створана для распаўсюджвання любові на зямлі. Мужчына створаны і пакліканы для таго, каб дзякуючы сваёй рацынальнасці і аналітычнасці рабіць свет лепшым. Дык у чым канкрэтна адрозніваюцца жанчына і мужчына?

Жанчына праз сваю скіраванасць на мацярынства адорана нашым Створцам перш за ўсё такімі якасцямі, як далікатнасць, вытанчанасць, пяшчотнасць, якія так неабходныя для маленькай чалавечай істоты, што прыходзіць у гэты свет. Яна адорана таксама асаблівай назіральнасцю і ўважлівасцю да дробязяў. Жанчына памятае пра ўсё. Жанчына створана так, што здольная на абсалютную падзеленасць сваёй увагі, якая дапамагае ёй лёгка і свабодна рабіць шмат рэчаў адначасова — прыбіраць, гатаваць, прыслухоўвацца, як спіць дзіця, і пры гэтым яшчэ размаўляць з сяброўкай па тэлефоне. І для нармальнага функцыянавання сям'і і дома ўсе гэтыя яе здольнасці проста неабходныя.

Яшчэ адна адметная якасць жанчыны — хуткая рэакцыя на тое, што адбываецца навокал. Калі малеча ў небяспецы, то жанчына адразу дзейнічае – як добра, што Створца і пра гэта паклапаціўся! Жанчына заўсёды адкрыта на актыўны дыялог – паведамляць, пераказваць, і таму дзіця вучыцца хутка і бесперапынна. Жанчына надзелена здольнасцю праяўляць клопат і ахвярнасць, скіраваныя на канкрэтнага чалавека, якому гэта патрэбна, аказваць менавіта канкрэтную дапамогу.

Ужо на пачатку стварэння Бог адарыў мужчыну адказнасцю за тое, што адбываецца паміж жанчынай і мужчынам. Нягледзячы на тое, што менавіта Ева спакусіла Адама, адказвае перад Богам ён, бо ён мужчына і павінен ведаць, якім будзе вынік яго дзейнасці. Мужчына павінен быць стабільным падмуркам для жанчыны і дзяцей. Менавіта ён павінен ствараць у сям'і атмасферу бяспекі і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Гэта бацька вучыць дзяцей разумець свет. Як ён бачыць наваколле, так і ягоныя дзеці будуць глядзець на гэты свет. Таму перш за ўсё сам мужчына павінен выпрацаваць сваё разуменне рэчаіснасці, каб ягоныя нашчадкі не страцілі сябе ў разуменні свету.

Уласным прыкладам бацька вучыць адносінам да маці, жанчыны, дапамагае жанчыне-маці раскласці ўсе свае шматлікія абавязкі па чарзе і не заблытацца ў іх, бо ягоная рацыянальнасць дазваляе вызначыць іерархію вартасцяў у сям'і. Ён не дазваляе жанчыне згубіцца ў дробязях.

*Ірэна Шмак*

*Ave Maria №12 (165) 2008*

*Працяг будзе.*

# ЯК РАЗМАЎЛЯЦЬ ПРА ВЕРУ З ТЫМІ, ХТО НІ Ў ШТО НЕ ВЕРЫЦЬ

*Некалі я прызнаўся сваёй сяброўцы, што цяпер веру ў Бога, яна паглядзела на мяне так, нібы я звар'яцеў.*



Я быў адным з тых атэістаў, якія з любой нагоды і пытання, звязаных з хрысціянствам, з пачуццём уласнай годнасці адказвалі цытатай з Маркса або Ніцшэ, ну ці з усяго вышэйпералічанага. Мякка кажучы, я быў варожа настроены ў адносінах да рэлігіі.

Ісціна не мае патрэбы ў тым, каб яе даказвалі; але варта ведаць, як яе даказаць, калі пачнуць пытацца.

Досвед мне паказаў, што думаюць людзі па абодва бакі барыкад, і я магу сказаць з упэўненасцю, што многія хрысціяне з такой стараннасцю спрабуюць заваяваць розумы і сэрцы непакорных, што дамагаюцца толькі зваротнага эфекту – людзі пачынаюць іх цурацца. У працэсе ўгаворванняў яны забываюць пра некаторыя асноватворныя хрысціянскія мудрыя правілы, якія так пераканаўча дзейнічаюць на тых, «хто ні ў што не верыць».

Вось некалькі прапаноў адносна таго, як распавядаць пра веру тым, хто не верыць.

Тое, што вы гаворыце, павінна быць, перш за ўсё, разумным, а не проста эмацыйным.

Сярод тых людзей, якія адмаўляюць усялякую веру, існуе меркаванне, што вера заснавана вы-ключна на эмоцыях і пазбаўлена разумнага зместу. У размове з агностыкам або атэістам хрысці-яне занадта часта пераходзяць на эмацыйную мову: «Калі я даверыўся Госпаду ...», «Бог быў такі добры адносна мяне ...» і г.д.

Нічога няправільнага ў гэтым няма – мы пакლі-каны да таго, каб распавядаць пра сваю веру. Але атэістам і агностыкам цалкам чужая мова веры, яны знаходзяць яе нязручнай і раздражняльнай. Усё роўна, што вам прыйшлося б выслухаць цэлую тыраду пра нейкага сябра вашага сябра, якога вы і ў вочы не бачылі.

Акрамя таго, калі вы спадзеяцеся толькі на эмацыйны доказны бок вашай гутаркі, то пазбаўляеце свайго суразмоўцу магчымасці даведацца пра глыбокую багатую гісторыю хрысціянскай думкі.

Вучэнні самога Ісуса – прыклад выдатнай логікі. Калі мы хочам пераймаць Яго стыль, то трэба прымушаць сябе гаварыць не толькі з перакананасцю, але і з разумнымі довадамі.

Памятайце, сама ісціна, можа, і не мае патрэбы ў доказе, але калі пачнуць пытацца – трэба здолець даць разумны адказ. Неабходна «быць у тэме па поўнай» – прапампаваць сябе па гісторыі і хрысціянскай філасофіі, а таксама гісторыі атэізму, каб і самім яшчэ больш умацавацца ў веры і знайсці агульныя для размоў тэмы з нашымі суседзямі. Гэта несумненна зблiжае.

### *Шукайце агульную мову ў незямной сферы*

Самае дзіўнае, што па дадзеных апытаннях 68% амерыканцаў, якія не прызнаюць ніякую рэлігію, усё роўна вераць у Бога і хочуць атрым-ліваць хоць нейкі духоўны вопыт. Нават самыя бескампрамісныя атэісты праявілі ўсвядомленае імкненне да чагосьці звышнатуральнага, іншымі словамі, яны хочуць не проста ведаць нешта пра Бога, але адчуваць Яго на глыбокім духоўным, незямным узроўні, выходзячы за рамкі матэрыяльнага свету.

Прасцей кажучы, як бы ні стараліся нам у культуры навязаць меркаванне, што ў жыцці рэальна толькі тое, што можна вымераць і ўбачыць, дзесьці ў падсвядомасці ўсё роўна сядзіць думка, што «ў любой мове ёсць той іншы бок, на якім знаходзіцца нешта, што падтрымлівае яго, але што не месціцца ў ім ... Гэтае нешта мы і называем Богам».

І нават калі вы будзеце суперпераканаўча распавядаць сваім сябрам-атэістам, што супакой, які яны адчуваюць у прыродзе, або прыліў энергіі падчас праслухоўвання музыкі ёсць не што іншае, як канкрэтны вынік жыццядзейнасці канкрэтнага Бога, вам наўрад ці ўдасца пераканаць іх у гэтым, але, па меншай меры, яны зразумеюць, што паміж вамі ёсць нешта агульнае.

*Паводле Grodnensis.by*
*Фота з evgenia-tishina.livejournal.com*
*Працяг будзе.*

## ВІНШУЕМ МАЛАДЫХ

**Давяраем добраму Богу сужэнскае жыццё маладых людзей, якія вырашылі быць заўсёды разам, і просім для іх асаблівага Божага блаславення:**



1. Андрэя Салаховіча і Алену Тарасевіч
2. Максіма Крывулька і Дар’ю Качан
3. Станіслава Трашко і Наталлю Іваноўскую
4. Дзмітрыя Горбіка і Таццяну Маруковіч
5. Віктара Цімошку і Марыю Цімошка (Гасюк)
6. Віталія Матронкіна і Вераніку Вайтковіч
7. Алега Лапкоўскага і Марыю Ігнатчык
8. Часлава Мухляда і Аксану Мухляда
9. Юрыя Ждановіча і Вольгу Паўлаву
10. Рамана Берліна і Валянціну Берліну

## СВЯТЫ ХРОСТ

**З радасцю паведамляем, што за апошні час Сакрамант Хросту атрымалі:**



1. Вікторыя Пясецкая, дачка Міхаіла і Наталлі
2. Ганна Рогач, дачка Сяргея і Кацярыны
3. Марк Ваўчок, сын Дзяніса і Галіны
4. Агата Каспяровіч, дачка Цімафея і Таццяны
5. Дзіяна Гадунова, дачка Юрыя і Веранікі
6. Надзея Швядко, дачка Сяргея і Анастасіі
7. Арцём Крошкін, сын Ігара і Інгі
8. Святаслаў Рослік, сын Івана і Таццяны
9. Паліна Пунтус, дачка Аляксея і Валянціны
10. Васіліса Трахневіч, дачка Ягора і Яўгеніі
11. Данііл Далідовіч, сын Віталія і Настассі
12. Цімафей Мроган, сын Валянціна і Вольгі
13. Алісія Апімаховіч, дачка Андрэя і Наталлі
14. Глеб Блатун, сын Яўгенія і Настассі

# СВЯТЫ ХРОСТ



15. Яна Болтуць, дачка Юрыя і Таццяны
16. Ксенія Ламаноўская, дачка Анатолія і Кацярыны
17. Радзіон-Аляксей Сузановіч, сын Андрэя і Наталлі
18. Якуб Воранаў, сын Аляксандра і Юліі
19. Марыя Касцянкова, дачка Алега і Ганны
20. Кіра-Марыя Коўш, дачка Юрыя і Марыны
21. Кім-Ян Кішкель, сын Яўгенія і Надзеі
22. Дар'я Юрчэня, дачка Сяргея і Наталлі
23. Міхаіл Лявіцкі, сын Аляксея і Ганны
24. Марыя Ніколіна, дачка Максіма і Тэрэзы
25. Міланія Магуліс, дачка Альберта і Наталлі
26. Ян Скарына, сын Сяргея і Валянціны
27. Яна Слабко, дачка Аляксея і Лідзіі
28. Наталля Ніканюк, дачка Віталія і Юліі
29. Павел Дзенісенка, сын Сяргея і Аксаны
30. Стэфан Жукоўскі, сын Уладзіміра і Кацярыны
31. Андрэй Палубочка, сын Івана і Алены
32. Глеб навасад, сын Дзмітрыя і Дар'і
33. Цімафей-Антоній Самец, сын Юрыя і Алены
34. Міраслаў Юзэф Камчыц, сын Андрэя і Таццяны
35. Есенія Дашкевіч, дачка Анатолія і Таццяны
36. Вольга Мартуль, дачка Ігара і Таццяны
37. Аляксандра-Марыя Кутас, дачка Паўла і Анжэлікі
38. Аляксей Курдэка, сын Віталія і Таццяны
39. Эмілія-Сусанна Германовіч, дачка Андрэя і Марыі
40. Аляксандра КУальчынская, дачка Барыса і Яўгеніі
41. Раман Чыгрынаў, сын Максіма і Ганны
42. Ульяна-Яна Мельцэр, дачка Віталія і Святланы
43. Кацярына-Марыя Пірагоўская, дачка Паўла і Наталлі
44. Софія Вырастка, дачка Міхаіла і Алены
45. Анастасія Апімаховіч, дачка Аляксея і Лілііі

Marzenka

## СВЯТАЯ ІМША БУДЗЕ АДСЛУЖАНА

________ . ________ 2015г. у ________ . ________ гадзін

у інтэнцыі ______________________________________________

______________________________________________________

| 2 лістапада Панядзелак | 6 кастрычніка Аўторак | 7 кастрычніка Серада | 8 кастрычніка Чацвер | 9 кастрычніка Пятніца | 10 кастрычніка Субота | 11 кастрычніка Нядзеля |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 07.00 - ✝ | 7.00 - ✝ | 7.00 - * | 7.00 - * | 7.00 - ✝ | 8.00 - ✝ | 08.00 - * |
| 09.00 - ✝PL | 9.00 - ✝PL | 9.00 - ✝PL | 9.00 - *PL | 9.00 - ✝PL | 9.00 - * PL | 09.00 - *PL |
| 11.00 - ✝ | 12.00 - ✝ | 12.00 - * | 12.00 - ✝ | 12.00 - * | 12.00 - ✝ | 11.00 - S |
| 13.00 - ✝PL | 15.00-Вяч | 15.00-Вяч | 15.00-Вяч | 15.00-Вяч | 15.00-Вяч | 13.00 - *PL |
| 15.00 - ВячPL | 17.00 - ✝ | 17.00 - ✝ | 17.00 - ✝ | 17.00 - скл | 17.00 - ✝ | 14.00 - * |
| 17.00 - ✝ | 19.00 - скл | 19.00 - скл | 19.00 - скл | 19.00 - скл | 19.00 - скл | 15.00 - |
| 19.00 - скл | | | | | | 15.00 - ВячPL |
| 21.00 - ✝ | | | | | | 17.00 - * |
| | | | | | | 19.00 - * |
| | | | | | | 21.00 - * |

* – Святая Імша ў інтэнцыі аб здароўі, Божым блаславенстве, апецы Маці Божай

✝ – Святая Імша ў інтэнцыі памерлых

S – Summa – Святая Імша ў інтэнцыі парафіі

PL – Святая Імша на польскай мове

Вяч – Вячыстая Святая Імша за чыстцовыя душы

скл – Святая Імша складковая; мл – Святая Імша для моладзі; слых – Святая Імша для глуханямых

**Вячыстая Адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту** – у капліцы Маці Божай Будслаўскай

**15.00** – Вячыстая Святая Імша ля алтара Божай Міласэрнасці ў інтэнцыі памерлых

# АНОНСЫ

## РЭГІСТРАЦЫЯ ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ СУСТРЭЧЫ МОЛАДЗІ ТЭЗЭ

*Пачалася рэгістрацыя для ўдзелу ў Еўрапейскай сустрэчы моладзі Тэзэ*

Ужо зараз маладыя людзі з Беларусі могуць зарэгістравацца для ўдзелу ў Еўрапейскай сустрэчы моладзі, якую штогод праводзіць экуменічная супольнасць Тэзэ (Францыя).

Сустрэча моладзі пройдзе з 28 снежня 2015 года па 1 студзеня 2016 года ў Валенсіі (Іспанія).

Прайсці рэгістрацыю і атрымаць падрабязную інфармацыю можна на www.taize.fr.

Сёлетняя Еўрапейская сустрэча моладзі прайшла ў Празе (Чэхія), у ёй прынялі ўдзел каля 30 тысяч чалавек.

Жыхарам Беларусі, якія плануюць прывезці групы моладзі, неабходна звязацца з info.by@taize.fr, каб удакладніць, як гэта магчыма ажыццявіць.

Запрашаем усіх жадаючых маладых людзей прыняць актыўны ўдзел у гэтай сустрэчы.

Голас душы №10 (525) 2015. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1188. Выдадзена міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь 8 лютага 2010 г.
Заснавальнік: грамадскае аб'яднанне «Хрысціянскае таварыства міласэрднасці». Выдаецца з верасня 2000г. на беларускай, рускай, лацінскай і польскай мовах.
Галоўны рэдактар – Кс. Уладыслаў Мацвеевіч Завальнюк, адказны рэдактар – Наталля Лаўрэнка, карэктар – Аліна Грачухіна. Падпісны індэкс: 63135.Свабодны кошт.
Адрас рэдакцыі: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 15. Тэл.: (017) 200-44-15, (017) 200-56-32. Факс: (017) 200-55-61, E-mail: natallias@tut.by,
www.churchminsk.by. Падпісана да друку 29.10.2015 у 09:10. Фармат 60х84 1/8. Надрукавана СТАА «Эвалайн», вул. Рыбалка, 9, оф.23, 220033 г.Мінск.
ЛП №02330/381. Наклад : 300 асобнікаў. Заказ № ___.

# СЛОВА БОЖАЕ Ў НЯДЗЕЛЮ

## 8 ЛІСТАПАДА — 32-я ЗВЫЧАЙНАЯ НЯДЗЕЛЯ

### ЧЫТАННЕ ПЕРШАЙ КНІГІ ВАЛАДАРСТВАЎ

*(1 Вал 17, 10-16)*

У тыя дні:

Устаў прарок Ілля і пайшоў у Сарэпту. І калі падышоў да брамы горада, з'явілася перад ім удава, якая збірала дровы. І паклікаў яе, кажучы: Прынясі мне трохі вады ў збане напіцца. Калі яна пайшла прынесці вады, ён крыкнуў услед: Вазьмі, прашу, для мяне і кавалак хлеба.

Яна ж адказала: На жыццё Госпада, твайго Бога, не маю печыва, толькі жменю мукі ў кадушцы і трохі алею ў збане. Вось збяру некалькі кавалкаў дрэва і пайду, згатую сабе і майму сыну. З'ямо гэта і памром.

Ілля сказаў ёй: Не бойся, але ідзі і зрабі, як сказала. Толькі спачатку зрабі невялікі праснак для мяне і прынясі мне. Сабе ж і сыну зробіш потым. Бо так кажа Госпад, Бог Ізраіля: Кадушка мукі не скончыцца, і збан алею не апусцее аж да дня, калі Госпад спашле дождж на зямлю.

Яна пайшла і зрабіла, як сказаў Ілля. І штодня елі ён, яна і дом яе. І так было кожны дзень. Кадушка мукі не скончылася, і збан алею не апусцеў паводле абяцання, якое Госпад даў праз Іллю.

***Лектар:*** Гэта слова Божае.

***Усе:*** Дзякуем Госпаду Богу.

### ПСАЛОМ

*(Пс 146 (145), 6c-7. 8-9a. 9bc-10 (Р.: 1))*

***Рэфрэн: Хвалі, душа мая, Госпада***

Бог навекі захоўвае вернасць. *
Справядліва судзіць пакрыўджаных,
хлеб дае пакорным, *
Госпад вызваляе вязняў.

***Рэфрэн.***

Госпад адкрывае вочы сляпым, *
Госпад узнімае прыніжаных.
Госпад любіць справядлівых, *
Госпад абараняе чужаземцаў.

***Рэфрэн.***

Госпад сірату і ўдаву падтрымлівае, *
а шлях грэшных скрыўляе.
Госпад валадарыць навекі, *
твой Бог, Сіёне, з пакалення ў пакаленне.

***Рэфрэн.***

## ЧЫТАННЕ ПАСЛАННЯ СВЯТОГА АПОСТАЛА ПАЎЛА ДА ЯЎРЭЯЎ

*(Яўр 9, 24-28)*

Хрыстос увайшоў не ў свяцілішча, пабудаванае рукамі на ўзор праўдзівых, але ў само неба, каб цяпер заступіцца за нас перад абліччам Бога; і не дзеля таго, каб шматразова прыносіць сябе ў ахвяру, як штогод уваходзіць першасвятар у Святое святых з чужою крывёю, бо Яму трэба было б шмат разоў цярпець ад пачатку свету. Цяпер жа Ён адзін раз на сканчэнні вякоў з'явіўся дзеля знішчэння граху сваёю ахвяраю. І як людзям прызначана раз памерці, а пасля гэтага – суд, так і Хрыстос, раз ахвяраваўшы сябе, каб панесці грахі многіх, другі раз без грэху з'явіцца тым, хто чакае Яго дзеля збаўлення.

***Лектар:*** Гэта слова Божае.

***Усе:*** Дзякуем Госпаду Богу.

***Алелюя, алелюя, алелюя!***
Шчаслівыя ўбогія духам,
бо іх ёсць Валадарства Нябеснае.
***Алелюя, алелюя, алелюя!***

## ✠ЧЫТАННЕ СВЯТОГА ЕВАНГЕЛЛЯ ПАВОДЛЕ МАРКА

*(Мк 12, 41-44)*

Сеўшы насупраць скарбонкі, Ісус назіраў, як людзі кідалі грошы ў скарбонку. Многія багатыя кідалі памногу. І прыйшла адна бедная ўдава, і ўкінула дзве лепты, што складае чвэрць аса.

Паклікаўшы вучняў сваіх, Ісус сказаў ім: Сапраўды кажу вам, што гэтая бедная ўдава ўкінула больш за ўсіх, хто кідаў у скарбонку. Бо ўсе кідалі, маючы лішак, а яна, будучы ў нястачы сваёй, укінула ўсё, што мела, увесь пажытак свой.

***Святар:*** Гэта слова Госпада.

***Усе:*** Хвала Табе, Хрысце.



# СЛОВА БОЖАЕ Ў НЯДЗЕЛЮ

## 15 ЛІСТАПАДА — 33-я ЗВЫЧАЙНАЯ НЯДЗЕЛЯ

### ЧЫТАННЕ КНІГІ ПРАРОКА ДАНІЭЛЯ

*(Дан 12, 1-3)*

Паўстане ў той час Міхал, князь вялікі, які стаіць для абароны сыноў народа твайго. І надыдзе цяжкі час, якога не было з таго моманту, калі пачалі існаваць народы, аж да гэтай пары. І ў той час збавіцца народ твой, кожны, каго знойдуць запісаным у кнізе. І многія з тых, хто спіць ў пыле зямным, абудзяцца: адны – да вечнага жыцця, другія – на вечную ганьбу. І тыя, хто мудры, будуць ззяць, як свяцілы небасхілу, а тыя, хто навучыць многіх справядлівасці – як зоркі на вечную вечнасць.

***Лектар:*** Гэта слова Божае.

***Усе:*** Дзякуем Госпаду Богу.

### ПСАЛОМ

*(Пс 16 (15), 5 і 8. 9–10. 11 (Р.: 1))*

***Рэфрэн: Захавай мяне, Божа, бо на Цябе спадзяюся***

Госпад частка спадчыны маёй і келіха майго, *
Ён лёс мой трымае.
Госпада я маю заўсёды перад вачыма, *
Ён праваруч мяне, і я не пахіснуся.

***Рэфрэн.***

Таму радуецца маё сэрца і весяліцца душа, *
і цела маё будзе спачываць бяспечна,
бо не пакінеш душы маёй у адхлані *
і не дасі святому Твайму ўбачыць тленне.

***Рэфрэн.***

Ты дарогу жыцця мне пакажаш, *
паўната радасці перад Табою,
вечнае шчасце *
праваруч Цябе.

***Рэфрэн.***



## ЧЫТАННЕ ПАСЛАННЯ СВЯТОГА АПОСТАЛА ПАЎЛА ДА ЯЎРЭЯЎ

*(Яўр 10, 11-14. 18)*

Браты:

Кожны святар штодзённа стаіць у служэнні і шмат разоў прыносіць адны і тыя ж ахвяры, якія ніколі не могуць знішчыць грахоў.

А Ісус Хрыстос, прынёсшы адну ахвяру за грахі, назаўсёды сеў праваруч Бога, чакаючы таго часу, калі ворагі Ягоныя будуць пакладзены як падножжа ног Ягоных. Бо Ён адной ахвярай назаўсёды зрабіў дасканалымі тых, каго асвячаюць.

А дзе ёсць прабачэнне грахоў, там ужо няма ахвяры за іх.

***Лектар:*** Гэта слова Божае.

***Усе:*** Дзякуем Госпаду Богу.

***Алелюя, алелюя, алелюя!***
Чувайце ўвесь час і маліцеся,
каб вы маглі стаць перад Сынам Чалавечым.
***Алелюя, алелюя, алелюя!***

## ✠ЧЫТАННЕ СВЯТОГА ЕВАНГЕЛЛЯ ПАВОДЛЕ МАРКА

*(Мк 13, 24-32)*

У той час:

Ісус сказаў сваім вучням: У тыя дні пасля таго ўціску зацьміцца сонца, і месяц не дасць святла свайго. І зоркі будуць падаць з неба, і сілы нябесныя пахіснуцца.

Тады ўбачаць Сына Чалавечага, Які будзе ісці на аблоках з вялікай сілай і ў славе. Ён пашле тады Анёлаў сваіх і збярэ выбраных сваіх ад чатырох вятроў, ад краю зямлі да краю неба.

Вучыцеся на прыкладзе смакоўніцы: калі галінка яе становіцца ўжо мяккай і распускаецца лісце, ведаеце, што блізка лета. Так і вы, калі ўбачыце, што адбываецца гэта, ведайце, што блізка Ён, пры дзвярах.

Сапраўды кажу вам: не міне пакаленне гэтае, пакуль не адбудзецца ўсё гэта. Неба і зямля праміnуць, а словы Мае не праміnуць.

А пра дзень той або гадзіну ніхто не ведае: ні Анёлы ў небе, ні Сын, а толькі Айцец.

***Святар:*** Гэта слова Госпада.

***Усе:*** Хвала Табе, Хрысце.

# СЛОВА БОЖАЕ Ў НЯДЗЕЛЮ

## 22 ЛІСТАПАДА — УРАЧЫСТАСЦЬ ГОСПАДА НАШАГА ІСУСА ХРЫСТА – ВАЛАДАРА СУСВЕТУ

## ЧЫТАННЕ КНІГІ ПРАРОКА ДАНІЭЛЯ

*(Дан 7, 13-14)*

Бачыў я ў начных візіях: вось разам з аблокамі нябеснымі ішоў нібы Сын Чалавечы, наблізіўся Ён да Старадаўняга, і быў падведзены да Яго. І дадзена Яму была ўлада, і гонар, і валадарства. І ўсе народы, плямёны і мовы служылі Яму. Улада Ягоная – вечная ўлада, якая не адымецца. І валадарства Ягонае не будзе знішчана.

***Лектар:*** Гэта слова Божае.

***Усе:*** Дзякуем Госпаду Богу.

## ПСАЛОМ

*(Пс 93 (92), 1ab. 1c–2. 5 (Р.: 1a))*

***Рэфрэн: Госпад валадарыць, Ён апрануўся ў веліч***

Госпад валадарыць, *
Ён апрануўся ў веліч,
Госпад апрануўся ў магутнасць *
і ёй падперазаўся.

***Рэфрэн.***

Так сусвет умацаваў, *
што не пахіснецца.
Адгэтуль трон Твой непахісны, *
Ты існуеш спрадвеку.

***Рэфрэн.***

Сведчанні Твае вельмі праўдзівыя, *
дому Твайму належыць святасць,
на доўгія дні, *
о Госпадзі.

***Рэфрэн.***

## ЧЫТАННЕ КНІГІ АПАКАЛІПСІСА
## СВЯТОГА АПОСТАЛА ІААНА

*(Ап 1, 5-8)*

Ласка вам і спакой ад Ісуса Хрыста, вернага сведкі, першароднага сярод памерлых і першага сярод зямных валадароў.

Таму, хто любіць нас і хто праз Сваю кроў вызваліў нас ад нашых грахоў, і ўчыніў нас валадарствам і святарамі для Бога і Айца свайго, Яму хвала і моц на вякі вечныя. Амэн.

Вось Ён прыходзіць з аблокамі, і кожнае вока ўбачыць Яго і ўсе тыя, хто Яго працяў. І будуць аплакваць Яго ўсе пакаленні зямлі. Так, амэн.

Я – Альфа і Амега, – кажа Госпад Бог, – Які ёсць, Які быў і Які прыходзіць, Усемагутны.

***Лектар:*** Гэта слова Божае.

***Усе:*** Дзякуем Госпаду Богу.

***Алелюя, алелюя, алелюя!***
Баслаўлёны той, хто прыходзіць у імя Госпада!
Баслаўлёнае валадарства айца нашага Давіда, якое надыходзіць!
***Алелюя, алелюя, алелюя!***

## ✠ЧЫТАННЕ СВЯТОГА ЕВАНГЕЛЛЯ ПАВОДЛЕ ЯНА

*(Ян 18, 33в-37)*

У той час:

Пілат спытаўся ў Ісуса: Ты Кароль юдэйскі?

Ісус адказаў яму: Ці ад сябе ты кажаш гэта, ці іншыя сказалі табе пра Мяне?

Пілат адказваў: Ці ж я юдэй? Твой народ і першасвятары выдалі Цябе мне. Што Ты зрабіў?

Ісус адказаў: Валадарства Маё не з гэтага свету. Калі б з гэтага свету было Маё Валадарства, то слугі Мае заступіліся б за Мяне, каб Я не быў выдадзены юдэям. Але цяпер Маё Валадарства не адгэтуль.

Пілат сказаў Яму: Значыць, Ты Кароль?

Ісус адказаў: Ты кажаш, што Я Кароль. Я для таго нарадзіўся і для таго прыйшоў на свет, каб засведчыць аб праўдзе. Кож-ны, хто ад праўды, слухае голас Мой.



***Святар:*** Гэта слова Госпада.

***Усе:*** Хвала Табе, Хрысце.

# СЛОВА БОЖАЕ Ў НЯДЗЕЛЮ

## 29 ЛІСТАПАДА — І НЯДЗЕЛЯ АДВЭНТУ, ГОД С

## ЧЫТАННЕ КНІГІ ПРАРОКА ЕРАМІІ

*(Ер 33, 14-16)*

Вось надыходзяць дні, – кажа Госпад, – калі Я выканаю абяцанне, якое абвясціў пра дом Ізраіля і пра дом Юды.

У тыя дні і ў той час Я ўзгадую для Давіда Парастак Справядлівасці, і будзе ён чыніць правасуддзе і справядлівасць на зямлі.

У тыя дні Юда будзе збаўлены і Іерусалім будзе жыць бяспечна, і назавуць яго: Госпад – наша справядлівасць.

***Лектар:*** Гэта слова Божае.

***Усе:*** Дзякуем Госпаду Богу.



## ПСАЛОМ

*(Пс 25 (24), 4-5ab. 8-9. 10 і 14 (Р.: 1b))*

***Рэфрэн: Да Цябе, о Госпадзі, узношу я душу маю***

Дай спазнаць Твае дарогі, Госпадзі, *
і навучы мяне сцежкам Тваім.
Вядзі мяне ў праўдзе Тваёй і навучы, *
бо Ты – мой Бог і Збаўца.

***Рэфрэн.***

Госпад – добры і справядлівы, *
таму паказвае грэшнікам шлях.
Ён кіруе прыніжанымі ў справядлівасці, *
і навучае пакорных шляхам сваім.

***Рэфрэн.***

Усе сцежкі Госпада – гэта міласэрнасць і вернасць *
для тых, хто захоўвае запавет і наказы Яго.
Госпад добразычлівы да тых, хто Яго баіцца, *
і запавет свой Ён адкрывае ім.

***Рэфрэн.***

## ЧЫТАННЕ ПЕРШАГА ПАСЛАННЯ СВЯТОГА АПОСТАЛА ПАЎЛА ДА ФЕСАЛАНІКІЙЦАЎ

*(1 Фес 3, 12 — 4, 2)*

Браты:

Няхай памножыць вас Госпад і перапоўніць вас любоўю адно да аднаго і да ўсіх, якую і мы маем да вас; каб умацаваць сэрцы вашыя беззаганнымі ў святасці перад Богам і Айцом нашым у час прыйсця Госпада нашага, Ісуса, з усімі Ягонымі святымі.

І ўрэшце, браты, просім вас і молім у Госпаду Ісусе, каб вы, прыняўшы ад нас тое, як трэба вам сябе паводзіць і дагаджаць Богу, як вы і паводзіце сябе, каб больш у гэтым узрасталі. Бо вы ведаеце, якія мы далі вам наказы ад Госпада Ісуса.

***Лектар:*** Гэта слова Божае.

***Усе:*** Дзякуем Госпаду Богу.

***Алелюя, алелюя, алелюя!***
Пакажы нам, Госпадзі, сваю міласэрнасць
і дай нам сваё збаўленне.
***Алелюя, алелюя, алелюя!***

## ✠ЧЫТАННЕ СВЯТОГА ЕВАНГЕЛЛЯ ПАВОДЛЕ ЛУКІ

*(Лк 21, 25-28. 34-36)*

У той час:

Ісус сказаў сваім вучням: Будуць знакі на сонцы і месяцы, і зорках, а на зямлі — спалох народаў і замяшанне ад гулу марскога хвалявання. Людзі будуць млець ад страху і ад чакання таго, што прыйдзе на свет, бо захістаюцца моцы нябесныя. І тады ўбачаць Сына Чалавечага, які будзе ісці ў воблаку з моцаю і славаю вялікай. Калі ж гэта пачне адбывацца, тады выпрастайцеся і падыміце галовы вашыя, бо набліжаецца адкупленне вашае.

Зважайце ж на сябе, каб сэрцы вашыя не былі абцяжараныя пахмеллем і п’янствам, і жыццёвымі клопатамі, і каб дзень той не застаў вас неспадзявана, як пастка. Бо ён прыйдзе на ўсіх, хто жыве на паверхні ўсёй зямлі. Дык чувайце ўвесь час і маліцеся, каб вы маглі пазбегнуць усяго таго, што павінна адбыцца, і стаць перад Сынам Чалавечым.

***Святар:*** Гэта слова Госпада.

***Усе:*** Хвала Табе, Хрысце.